***В. І. Раманенкава,***
*аспірантка Беларускага дзяржаўнага*
*ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ РЭЛІГІЙНАЯ МУЗЫКА РЫМА-КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў ЗАКАНАДАЎЧЫХ І ПРАВАВЫХ ДАКУМЕНТАХ

Беларуская рэлігійная культура зазвычай паўстае ў якасці дзвюх антаганістычных пачаткаў: традыцыйнай народная і царкоўнай (літургічнай). Безумоўна гэтыя два віды музычнай практыкі маюць глыбокія ўзаемасувязі. У шырокім сэнсе тэрмін *«рэлігійная музыка»* выкарыстоўваецца ў азначэнні музыкі, каторая мае рэлігійны змес, прызначана для выканання ў святыні альбо для суправаджэння пазалітургічных набажэнстваў у храме ці па-за храмам. У вузкім сэнсе – гэта музыка ахоплівае абшар спеваў з рэлігійнымі тэкстамі, якія функцыянуюць па-за літургічнай абраднасцю, у канкрэтных сітуацыях царкоўнага каляндара (песні перыяду Адвэнту[1], калядкі, песні на Вялікі пост), частка такога матэрыялу мае непасрэдную сувязь з абрадамі (пахавальныя песні).

Наша ўвага ў дадзеным артыкуле засярождана, непасрэдна, на традыцыйнай рэлігійнай музыцы і на тым, якое месца яна займае ў афіцыйных дакументах рымска-каталіцкай царквы.

У жанры рэлігійнай музыкі найбольш яскрава праяўляецца камунікатыўнасць – малітоўная сувязь чалавека з Богам. Спеву здаўна надавалася вялікае значэнне ў жыцці хрысціян. Існавала вялікая колькасць харавых калектываў прафесіянальных і аматарскіх.

Айцы цырквы ў IV–V ст. пісалі аб уздзеянні музыкі на душу чалавека. У эстэтыцы айцоў царквы музыка, як і ўсе мастацтвы ў цэлым, падпарадкоўваецца дыдактычным задачам. Яна ўсяго толькі прылада, якая робіць больш прывабным і даступным слова Святога Пісання [6, с. 149]. Айцы царквы патрабавалі падпарадкавання мелодыі тэксту, ставілі слова вышэй за музычнае выканання.

Паступова музыка вызваляецца ад кайданаў аскетычнай маралі і пачынае прызнавацца як свабоднае мастацтва.

Значэнне традыцыйнай рэлігійнай музыкі абмяркоўвалася не

[1] У каталіцкай Царкве Адвэнт распачынае новы год літургічны. Слова *adventus* паходзіць ад *advenire,* што азначае ‘прышэсце’ (gr. *Epiphania, parousia).* Адвэнт – час чакання Раства Хрыстовага.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аднаразова на Сусветных саборах[2], якія праводзіліся каталіцкай царквой.

Пачынаючы з першага, яшчэ не сусветнага, Іерусалімскага сабора (прыкладна 49 г.) да Трэцяга Таледскага сабора[3] (589 г.) аб народнай музыцы на сходах увогуле не ўзгадвалі, бо не лічылі, што пра такую музычную дзейнасць можна гаварыць – яе проста выключалі з поля зроку. І толькі ў 589 г. у пастанове Трэцяга Таледскага закона было напісана: «Падлягаюць выкараненню нерэлігійныя звычаі, якія ўсталяваліся ў народзе падчас святкавання дня святых, а менавіта: народ, які павінен чакаць службы, бавіць час у скоках і непрыстойных песнях» [10, с. 112].

Канстанцінопальскім Саборам[4] 692 года было вырашана канчаткова знішчыць тое, што называюць «Calendes», «Voeux», «Brumaires» (Калядкі, песні-пажаданні) [7, с. 86].

Папа Рымскі Леў IV (790–855 гг.) у пасланні да епіскапаў пісаў: «Забараняйце песні і танца жанчын у царкве; пазбягайце д’ябальскіх песень, якія просты народ звычайна спявае ў начныя гадзіны над мёртвымі, і народны смех, і рогат» [1, с. 931].

У дакуменце аб царкоўным выканальніцтве «Institutio de modo psallendi» (XV ст.) чытаем: «Мы адмаўляем і забараняем у хорах нашых царкоўных шутаўскія галасы (*histrioneas voces*), шчабечучыя, альпійскія або горныя, пярунападобныя або свісцячыя, іржучыя па-аслінаму або бляючыя накшталт авечак; забараняем жаночыя галасы, усякую фальш у галасах, ганарыстасць і новаўвядзенні, бо ўсё гэта больш адклікаецца мітуснёй і глупствам, чым рэлігіяй» [6, с. 315].

З вышэй пададзеных цытат з рэлішійных дакументаў бачым, што традыцыйную музыку царква не прымала ў свае ўлонне. Але, калі ішла такая актыўная барацьба з народнай музыкай, можам зрабіць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

---

[2] Сусветныя саборы (грэч. Σύνοδοι Οικουμενικαί, лац. *Oecumenica Concilia*) – сходы пераважна епіскапату хрысціянскай Царквы ў яе паўсюднай паўнаце, на якіх абмяркоўваюцца пытанні і выносяцца рашэнні дактрынальнага (дагматычнага), царкоўна-палітычнага і судова-дысцыплінарнага характару.

[3] Таледскі сабор 589 года вядомы, таксама як Трэці Таледскі сабор, скліканы вестгоцкім каралём Рэккарэда I пасля яго пераходу з арыянства ў каталіцтва, завяршыў арыянскі перыяд у гісторыі вестготаў. Сабор палажыў пачатак новага этапу ўзаемадзеяння царквы і дзяржавы ў Іспаніі [10, с.  97–100].

[4] Трульскі сабор, таксама Пята-шосты сабор (грэч. Πενθέκτη Σύνοδος) – сабор Царквы ў Канстанцінопалі ў 691–692 гг.; скліканы імператарам Юстыніянам II у 691; яго дакументы маюць выключна важнае значэнне як крыніца ўнутранага царкоўнага права для праваслаўных цэркваў, якія разглядаюць іх як дакументы Шостага Сусьветнага Сабору [5, с. 428-472].

выснову, што гэта творчасць актыўна існавала ў бытавым асяроддзі і спрабавала пранікнуць у «на тэрыторыю» кананічных спеваў.

Актыўныя крокі наперад (па ўкараненні ў літургічны абіход) рэлігійная музыка пачала рабіць прыкладна ў XVI–XVIII стст., калі некаторыя набажэнствы спяваліся на родных мовах, а не па лаціне, як было раней, напрыклад, «Песні жальбы»[5], Маёвае набажэнства[6] (пачатак XIX ст.). Такога кшталту песні хутка распаўсюджваліся сярод вернікаў, дзякуючы народнай мове, іх імгненна запаміналі і спявалі потым у прыватных дамах. Але афіцыйна царквой такія песні не прызнаваліся літургічнымі.

Згодна з VII-м канонам Трыдэнцкага Сабора[7] выдадзеным Папам Піем IV «Benedictus Deus» нельга дапускаць у цэрквах такой музыкі, дзе на аргане або ў спевах прымешваецца нешта распуснае або нячыстае, а таксама не дапускаць ніякіх свецкіх дзей, пустых размоў, гулянняў, шуму, крыкаў, каб дом Божы сапраўды мог бы называцца домам малітвы, дзе спеў выконваецца роўным харальным голасам [9].

Пасля першага Ватыканскага сабора (1869–1870) адбылося пераасэнсаванне духавенствам традыцыйнай рэлігійнай музыкі. Яе паўнаўласна дазволена выкарыстоўваць падчас набажэнстваў у вызначаны канонам момант.

Папа Пій XII[8] у энцыкліцы аб сакральнай музыцы «Encyklika musicae sacrae disciplina» (1955) звяртае ўвагу на тое, што трэба цаніць таксама і тую музыку (маецца на ўвазе традыцыйная музыка), якая не належыць непасрэдна да Святой Літургіі, але прыносіць значную карысць для рэлігійнага жыцця вернікаў, дзякуючы чаму можа называцца «рэлігійнай музыкай» [8, с. 72]. Аб прысутнасці ў хрысціянскім жыцці католікаў на Беларусі традыцыйных рэлігійных песень сведчасць музычныя зборнікі, якія выкарыстоўваліся вернікамі на літургіі, напрыклад: «Kantyczka

---

[5] Песні жальбы – набажэнства эўхарыстычнага характару, у тэкстах якіх закладзена гісторыя пакут і смерці Езуса Хрыста.

[6] Маёвае набажэнства – набажэнства, якое адзначаецца ў маі каталіцкай царквой у гонар Маці Божай, на працягу якога адмаўляецца ці спяваецца Лёрэтанская Літанія і малітва «Тваёй абароне».

[7] Трыдэнцкі сабор – XIX Сусветны сабор каталіцкай царквы, які адкрыўся па ініцыятыве Папы Паўла III 13 снежань 1545 г. у Трэнта і закрыўся там жа 4 снежня 1563 г., у пантыфікат Пія IV. Быў адным з найважнейшых сабораў у гісторыі каталіцкай царквы. Лічыцца адпраўной кропкай Контррэфармацыі [3, с. 113].

[8] Пій XII (лац. Pius XII, да інтранізацыі – Эўджэніо Марыя Джузэпэ Джавані Пачэлі, італ. *Eugenio Maria Giuseppe Giovanni Pacelli*; 1876–1958 гг. – папа рымскі з 2 сакавіка 1939 года, абвясціў дагмат аб Унебаўшэсці Дзевы Марыі і сімвалічна прысвяціў свет Беззаганнаму сэрцу Марыі ў 1942 г.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

czyli Pieśni nabożne» (1885), «Cantus ecclesiastici» (1911), «Cantionale ecclesiasticum Romano-catholicicum» (1862),[9] у іх друкаваліся ноты і тэксты літургічных і рэлігійных песень, дзе асобнае месца займалі песні на Вялікі пост і Вялікдзень, а таксама даваліся невялікія каментарыі да святаў.

Часта можна сустрэць такую з’яву, што рэлігійная песня, якая прызначана для выканання па-за святыняй, паважна спяваецца на набажэнстве. Згодна з Канстытуцыяй «Sacrosanctum Concilium», выдадзенай Другім Ватыканскім Саборам[10], традыцыйная музыка можа выкарыстоўвацца ў літургіі (за выключэннем асноўных частак лацінскай літургіі), а таксама ў паралітургічных набажэнствах. У главе 6 у параграфах 118 і 119 напісана: «Паколькі ў некаторых краінах, асабліва міссіянерскіх, ёсць народы, якія валодаюць уласнымі традыцыямі музычнага мастацтва, якія выконваюць важную ролю ў іх рэлігійным і грамадскім жыцці, гэтай музыцы належыць адводзіць адпаведнае месца …» [2, с. 47].

Сучасная рымска-каталіцкая царква выкарыстоўвае разнародныя віды і жанры рэлігійнай музыкі, пачынаючы ад грыгарыянскага харала і заканчваючы творамі прафесійных кампазітараў сучаснасці і фальклора.

Па інфармацыі Ватыканскага радыё, кардынал Джанфранка Равазі[11] падкрэсліў, што, акрамя музыкі мінулых часоў, Касцёл мае патрэбу ў вялікіх сучасных музыкантах, творы якіх дазволілі б перажываць літургію, дзякуючы новай мове. На думку кардынала, жаданне чуць у касцёле музыку простую і зразумелую не можа прывесці да яе баналізацыі; у творах заўсёды павінна захоўвацца сакральнае вымярэнне[4].

Рыкарда Муці[12], у сваю чаргу, адзначыў, што літургічная музыка павінна быць вельмі простай, каб яе маглі разумець і ўспрымаць

---

[9] Пералічаныя зборнікі песень зафіксаваны намі ў 2012–2013 гг. падчас навуковых экспедыцый па Гродненскай і Віцебскай абласцях.

[10] Другі Ватыканскі сабор – апошні на сённяшні час з Сабораў Каталіцкай царквы, па ліку Каталіцкай царквы XXI Сусветны Сабор, адкрыты па ініцыятыве папы Яна XXIII у 1962 і доўжыўся да 1965 г. (за гэты час папа змяніўся, сабор закрыўся ўжо пры папе Паўле VI). На саборы быў прыняты шэраг важных дакументаў, якія адносяцца да царкоўнага жыцця: 4 канстытуцыі, 9 дэкрэтаў і 3 дэкларацыі.

[11] Джанфранка Равазі (італ. Gianfranco Ravasi; нар. 18 кастрычніка 1942 г., Мерате, Італія) – італьянскі курыяльны кардынал. Тытулярны арцыбіскуп Вільяманы ін Прокунсолары з 3 верасня 2007 года па 20 лістапад 2010 г. Старшыня Папскай Рады па Культуры з 3 верасня 2007 г. Старшыня Папскай камісіі па культурнай спадчыне Царквы з 3 верасня 2007 г. Старшыня Папскай камісіі па Свяшчэннай археалогіі з 3 верасні 2007 г.

[12] Рыкарда Муці (італ. Riccardo Muti; нарад. 28 ліпені 1941 г., Неапаль) – італьянскі дырыжор, мастацкі кіраўнік тэатра «Ла Скала» у 1986–2005 гг.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

усе [4].

Хрысціянская музычная культура захоўвалася і актыўна развівалася да пачатку XX стагоддзя. А потым, на некаторы час затрымалася. Але рэлігійнае музычнае мастацва толькі візуальна страціла сваю значнасць. У побытавым асяродку людзей, у іх сэрцах і душах заўсёды жыла музычная рэлігійная традыцыя. Гістарычныя падзеі, развіццё грамадства, навукі, свядомасці людзей – усё гэта мае непасрэдны адбітак на хрысціянскай музыцы. І ў руках нашага пакалення на пачатку XXI стагоддзя ўзнавіць, адрадзіць і захаваць тое, што так старанна аберагалася і перадавалася нам.

---


1. *Грегоровиус, Ф.* История города Рима в Средние века (от V до XVI столетия) / Ф. Григоровиус; пер. с нем. М. Литвинова, В. Линде, В. Савина. – М. : Альфа-Книга, 2008. – 1280 с.

2. Документы II Ватиканского собора 1962–1965 гг. / пер. с лат. А. Коваля. – М. : Паолине, 1998. – 589 с.

3. История средних веков: в 2 т. / редкол.: З. В. Удальцовой, С. П. Карпова. – М. : Высш. школа, 1991. – 400 с.

4. Кардынал Равазі: Касцёл патрабуе сучаснай сакральнай музыкі [Электронны рэсурс]. – 2012. – Рэжым доступа: http://catholic.by/2/home/world/news/40-foreign/112812-sakrmuzyka.html. – Дата доступа : 06.06.2012.

5. *Карташев, А. В.* Вселенские Соборы / А. В. Карташев. – М. : Библиополис, 2002. – 560 с.

6. Музыкальная эстетика западноевропейского средневековья и Возрождения / сост. В. П. Шестаков. – М. : Музыка, 1966. – 562 с.

7. Concilium Constantinopolitanum a. 691/2 in Trullo habitum. H. Ohme (ed.) Acta conciliorum oecumenicorum, Series Secunda II: Concilium Universale Constantinopolitanum Tertium. – Berlin ; Boston : De Gruyter, 2013. – Pars 4. – 131 p.

8. Encyklika Musicae sacrae disciplina 1955 r. / Wiadomości Diecezjalne. – Katowice : Organ Urzędowy Archidiecezji Katowickiej, 1957- 61. – 83 s.

9. The Tridentine-gospel, or, papal creed made at Trent, and promulgated at Rome, by Pope Pius IV : exhibited and demonstrated to be new, heterodox, and antichristian : in a sermon [Electronic resource] / London : al Printed for F. Smith and H. Mortlock, 1672. – Mode of access : https://library.villanova.edu/Find/Search/Results?lookfor=%22Early+English+books+online.%22&type=Series. – Date of access : 31.03.2014.

10. *Thompson, E. A.* The Goths in Spain / E. A. Thompson. – Oxford : Clarendon Press, 1969. – 358 p.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ